УДК 821.161.3-31*Л. Рублеўская

К. Г. Навуменка

Навук. кір. – А. В. Брадзіхіна, канд. філал. навук, дацэнт

# МІСТЫЧНЫ ДЭТЭКТЫЎ «ДЗЕЦІ ГАМУНКУЛУСА» ЛЮДМІЛЫ РУБЛЕЎСКАЙ

Артыкул прысвечаны разгляду субжанру містычнага дэтэктыву на прыкладзе аповесці «Дзеці гамункулуса» Л. Рублеўскай. Аўтарам вызначаны комплекс асноўных спосабаў і прыѐмаў увасаблення містычнага пачатку ў творы, а таксама матыўна-вобразная сістэма, з дапамогай якой ствараецца атмасфера невытлумачальнага страху.

Дэтэктыў, або крымінальны аповед (ад лац. detectio „раскрыццѐ‟), – літаратурны і кінематаграфічны жанр, творы якога апісваюць працэс даследавання злачынства з мэтай высвятлення яго абставінаў і раскрыцця загадкі. Абавязковымі складнікамі дэтэктыва з‟яўляюцца загадкавае здарэнне, расследаванне, якое вядуць галоўныя героі, разгадка з тлумачэннем падзей, а таксама падказкі, якія чытач атрымлівае па ходзе апавядання. Наяўнасць доказаў, якія дазваляюць чытачу самастойна раскрыць сакрэт, з‟яўляецца абавязковай умовай класічнага дэтэктыва. Гэты жанр мае некалькі разнавіднасцей: гістарычны, іранічны, шпіѐнскі, утульны і шэраг іншых, але асаблівую цікавасць уяўляе фантастычны дэтэктыў. Творы такога паджанру ў дадатак да вышэй пералічаных рыс Литературоведение 98 маюць прыкметы фантастыкі, фэнтэзі, хорару, містыкі і пад. Дзеянне адбываецца ў альтэрнатыўным мінулым ці будучым, або ў свеце, створаным уяўленнем аўтара. Містычны, альбо акультны, дэтэктыў таксама сумяшчае ў сабе адметнасці крымінальнага і звышнатуральнага аповеду. Падзеі ў такім творы цесна звязаны з магіяй, вурдалакамі, прывідамі і іншымі хтанічнымі істотамі. Дэтэктыў нярэдка адносяць да формульных жанраў. Л. Алейнік у артыкуле «Масавая літаратура: сябар ці вораг» сцвярджае, што попкультура сфарміравала «дакладны звод “канонаў” – мадэль, што забяспечвае спецыфічную прагназаванасць развязкі, таму чытач амаль ніколі не застаецца расчараваным: злачынца заўсѐды пакараны, жанчына-пакутніца знаходзіць сваѐ каханне і г. д.» [1]. Усе гэтыя рысы прасочваюцца і ў творы «Дзеці Гамункулуса» сучаснай беларускай пісьменніцы Л. Рублеўскай, у фінале якога злачынца пан Рымант пакараны за свае ўчынкі, а галоўная гераіня Віка сустракае каханне і нарэшце адшуквае такое жаданае мора. У беларускай культуры ѐсць легендарны вобраз чарнакніжніка, астролага, экстрасэнса – пана Твардоўскага, які прадаў душу д‟яблу і нібыта меў рэальнага прататыпа. Гэты вобраз якраз і ляжыць у аснове аповесці Л. Рублеўскай. Жанравую прыналежнасць твора акрэсліла ў падзагалоўку сама пісьменніца: містычная аповесць. А гэта значыць, чытач разлічвае, што ў творы будзе шмат невытлумачальных падзей, звышнатуральных сіл і істот. Сведчаннем таму якраз і з‟яўляецца вобраз пана Твардоўскага, які ўпамінаецца ў пралогу аповесці, дзе распавядаецца дзіўная гісторыя пра спробу ведзьмака стварыць падобную да чалавека штучную істоту, якую потым назавуць гамункулусам. Для твора характэрна «двухсвецце» – спалучэнне рэальнасці і містыкі, прычым першая пераважае, арганізуючы мастацкі свет тэксту, а ірэальны пачатак толькі дадае нелагічнай вастрыні звыклым з‟явам. Жыццепадобным у аповесці выступае ўвесь свет, акрамя мястэчка, у якое накіроўваецца галоўная гераіня і дзе жыццѐ ідзе не так, як у іншых гарадах. Тут людзі нават знешне адрозныя ад звычайных. Віка атрымлівае камандзіроўку ў прыморскі горад і ў першы ж вечар адпраўляецца на шпацыр у пошуку мора, якое знаходзіцца побач. Яна нават адчувае яго салѐны пах. Але нейкім таемным чынам дзяўчына ніяк не можа дабрацца да мора, нават распытванне недружалюбных мясцовых жыхароў не дапамагае. З гэтага загадкавага факта і пачынаецца завязка містычнай гісторыі. 99 Далей клубок таямнічых падзей нарошчваецца вельмі імкліва. Калі дзяўчына засялілася ў гатэль, скрозь сон яна адчула дотыкі нечага агіднага і слізкага, а пакой запоўніўся рэзкім пахам ѐду. Такім чынам пісьменніца стварае эфект трывожнага прадчування перад магчымай большай небяспекай. Яшчэ адзін эпізод, на які трэба звярнуць увагу, – момант, калі Віка

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выйшла прайсціся і ў чарговы раз пашукаць мора. Па дарозе яна сустрэла прыгожага маладога мужчыну, які падаўся ѐй знаѐмым. Дзяўчына бачыла яго ў гатэлі і пазнала ў ім камандзіраванага з Рыгі з ружай у руцэ, які чакаў яе суседку Аліну. Але мужчына раптам сказаў, што ѐн мясцовы мастак, нават памятае дзяўчыну, якая прыязджала яшчэ да Вікі і з якой ѐн зладзіў добрую выставу. Тут невытлумачальныя з‟явы дапаўняюцца дэтэктыўнай інтрыгай, але далей сюжэт вяртаецца ў містычнае рэчышча. На шляху яны напаткалі касцѐл, і Віка захацела наведаць яго, каб пазбавіцца ад непажаданага спадарожніка. Мужчына, убачыўшы храм, згубіў здольнасць прамаўляць па-чалавечы, нешта «квакнуў» і прапаў у тумане. У касцѐле святы айцец распавѐў гераіні гісторыю свайго горада і тое, што на месцы храма раней стаяў дом, дзе некаторы час жыў знакаміты чарнакніжнік пан Твардоўскі, які скінуў створаную ім вусцішную штучную істоту ў калодзеж каля дома. Пасля гэтай сустрэчы галоўнай гераіні ўсю ноч сніліся «пачвары, вірлавокія і губастыя, яны брыдка смяяліся, квакалі, датыкаліся халоднымі ліпкімі лапамі, падобнымі на чалавечыя рукі гэтак жа, як труна падобная да калыскі. І падаў на гэтыя стварэнні цяжкі нерат са срэбраных ніцяў, і ўсѐ не мог зачапіць іх, і ўздымаўся наверх, да ледзь бачнай плямы святла наверсе...» [2]. Можна сказаць, што гэты эпізод – тая адпраўная кропка, з якой пачынаецца расшыфроўка невытлумачальных падзей. Пачуццѐ страху ўзмацняецца з кожнай уведзенай пісьменніцай дэталлю. Да Вікторыі падсяляецца новая суседка – паўнаватая жанчына сярэдніх гадоў, якая цікавіцца адначасова хірамантыяй, нумаралогіяй, астралогіяй, спірытызмам і патубаковымі з‟явамі. Жанчыны размаўляюць, п‟юць гарбату, і раптам Вікторыі падаецца, што ў Біргіты Эдуардаўны пазелянеў твар, а вусны расцягваюцца нібы да вушэй: «Біргіта Эдуардаўна пранікнѐна зазірала мне ў вочы сваімі вачыма, напалову прыкрытымі ніжнімі набраклымі павекамі, натхнѐна распавядала пра таемнасці, якіх я так прагла… “Госпадзе, не хачу… Госпадзе, што гэта за насланне?” – думкі мае рассыпаліся, як дзіцячая пірамідка. А суседка прапанавала, каб канчаткова пераканаць мяне ў існаванні нечага, учыніць спірытычны сеанс. Яна ведае, каго Литературоведение 100 выклікаць… І адкуль. Жыў некалі ў гэтым горадзе адзін вялікі сярэднявечны вучоны, астролаг і алхімік…» [2]. Гэта настолькі спужала дзяўчыну, што яна бегма пайшла з гатэлю. Пісьменніца стварае змрочную атмасферу і з дапамогай пейзажу (дробны дождж, туман, мѐртвая цішыня), што ўзмацняе спалох дзяўчыны, з аднаго боку, і ўводзіць чытача ў напружанне – з другога. Эфекты нечаканасці, супадзення і пазнавання таксама спрыяюць узнікненню невытлумачальнага страху. Касцѐл (сакральную прастору) раптоўна збіраюцца перарабіць пад канцэртную залу (прастору граху і забавы). Віка выпадкова бачыць, як некалькі чалавек спрабуюць нешта выкапаць на тэрыторыі храма. У гэтых людзях яна пазнае былую суседку Аліну, камандзіровачнага з Рыгі і сакратара пана Рыманта. Урэшце яны знаходзяць таямнічы каменны круг, які нагадвае калодзеж. Магчыма, здагадваецца гераіня, гэта тая студня, у якую скінуў гамункулуса пан Твардоўскі. Містычны пачатак узмацняецца алюзіяй на пахавальную працэсію, якую таксама лагічна растлумачыць нельга. Трэба сказаць, што за звычайнай містычнай гісторыяй, якая надае твору займальнасць, хаваецца глыбокі філасофскі сэнс. Пісьменніца ўздымае праблему выбару чалавека: быць самім сабой, г. зн. мець пачуцці і свабоду самавыяўлення, ці быць абыякавым і бездухоўным – у выніку закрыцца ад усяго свету і нічога не адчуваць. Адкрытае супрацьстаянне дзяцей гамункулуса і галоўных герояў прыводзіць да таго, што дзяўчына апынаецца ў рэальнай небяспецы і прачынаецца ў шпіталі. Але каханне, якое звязала Віку і Марціна, дазваляе ім перамагчы бездухоўнасць мясцовых жыхароў. Адпаведна мяняецца і прастора. Туман сыйшоў, і нарэшце дзяўчына пабачыла мора. Такім чынам, дэтэктыўная аповесць «Дзеці Гамункулуса» Л. Рублеўскай грунтуецца на містычным дапушчэнні. Невытлумачальныя з‟явы не атрымліваюць тут рацыянальнага абгрунтавання. Твор мае наступныя рысы містыкі: тэкст арганізаваны па прынцыпу двухсвецця, чытач да самага фіналу знаходзіцца ў напрузе, пісьменніца living рознымі сродкамі стварае атмасферу небяспекі і страху, першапрычынай якога становіцца вусцішная істота, насельнікі горада надзелены звышнатуральнамі якасцямі, героі актыўна цікавяцца патубаковымі з‟явамі і інш. Адметна, што Л. Рублеўская арганічна спалучае ў творы «беларускі матэрыял» і сусветную міфалогію. 101 Спіс літаратуры 1 Алейнік, Л. Масавая літаратура:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сябар ці вораг [Электроны рэсурс] / Л. Алейнік. – Рэжым доступу: http://philology.bsu.by/documents/ Кафедра% 20тэарэтычнага%20і% 20славянскага%20літаратуразнаўства/ Дысцыпліны/ Гісторыя% 20беларускага%20літаратуразнаўства%20і%20крытыкі/Практычныя% 20матэрыялы/Масавая%20літаратура_сябар%20ці%20вораг.pdf. – Дата доступу: 31.05.2021 г. 2 Рублеўская, Л. Дзеці гамункулуса [Электронны рэсурс] / Л. Рублеўская. – Рэжым доступу: http://lir-book.by/дзеці-гамункулусааповесць/. – Дата доступу: 03.03.2021 г.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ